ISSN 2351-6658
ISSN (ONLINE) 2351-6666

# ГОЛАД У БССР У 1946–1947 ГАДАХ У СВЯТЛЕ ЎСПАМІНАЎ СВЕДАК ЧАСУ

ІРЫНА КАШТАЛЯН

***Анатацыя:*** Голад у БССР 1946–1947 гадоў застаецца маладаследаванай тэмай беларускай гісторыі. Недастатковасць публікацый, архіўных дакументаў можа дапоўніць інфармацыя з успамінаў сведак, якія перажылі гэтую трагедыю. Важнымі крыніцамі з'яўляюцца інтэрв'ю, сабраныя Беларускім архівам вуснай гісторыі па дадзенай тэме на поўдні Беларусі ў 2013 годзе. Яны прадстаўляюць стратэгіі паводзін простых людзей, скіраваныя на выжыванне ў складаных умовах вострага недахопу харчавання.

***Ключавыя словы:*** голад, стратэгіі паводзін, сведка часу, інтэрв'ю, вусная гісторыя.

## THE FAMINE OF 1946–1947 IN THE BSSR BASED ON THE MEMORIES OF WITNESSES

***Abstract:*** Hunger in the BSSR of 1946–1947 remains a scarcely studied page of Belarusian history. The lack of publications and archival documents can be filled with information from the memories of witnesses, who survived this tragedy. The interviews collected in the south of Belarus in 2013 by Belarusian oral history archive present an important source on this theme. They show behavioural strategies of ordinary people, who survived in the conditions of critical food shortage.

***Keywords:*** Famine, Behavioural Strategies, Eyewitness, Interview, Oral History.

Голад у БССР пасля Другой сусветнай вайны застаецца маладаследаванай тэмай у беларускай гісторыі. У манаграфіях, якія прысвечаны пасляваеннаму аднаўленню Беларусі, гэтае пытанне не ўздымаецца. Ведаючы ўвагу да гэтай праблематыкі ў суседняй Украіне, беларускім навукоўцам варта было б асэнсаваць нашую складовую тэмы ў кантэксце савецкай і сусветнай гісторыі. Комплекснаму разгляду можа паспрыяць аналіз стаўлення простага чалавека, а не толькі чыноўнікаў, якія фармулявалі дадзеную праблему як "наяўнасць цяжкасцяў у сувязі з засухай і неўраджаем", але не згадвалі пра голад, хавалі пра яго інфармацыю. Таму важна выкарыстоўваць вуснагістарычныя крыніцы.

Голад у 1946–1947 гадах, выкліканы засухай і неўраджаем, у адрозненне ад РСФСР, Украіны і Малдовы, закрануў пераважна паўднёвыя раёны БССР. Асабліва складанае становішча склалася ў вёсцы, дзе ў 1946 годзе вельмі мала калгасаў праводзілі натуральную і грашовую аплату калгаснікам. Цяжкасць сітуацыі пацвярджаюць звесткі пра выпадкі дыстрафіі, смерцяў з-за голаду, выпадак канібалізму (Крупеня, 1947: 18). Падлік галадаючых праводзіць цяжка з-за недахопу дакументаў, аднак некаторыя тэндэнцыі можна адзначыць.

Больш за ўсё маецца звестак па Палескай вобласці. Паводле іх, па стане на 1 лютага 1947 года ў рэгіёне было больш за 7000 галадаючых сем'яў калгаснікаў, на 22 сакавіка такіх сем'яў налічвалі ўжо больш за 20000, ці да 70000 чалавек (Карасёў, 1947: 115–116), а на 11 ліпеня ўжо 230 тысяч чалавек не мелі хлеба і харчаваліся сурагатамі (Крупеня, 1947: 19). Дадзеная геаметрычная прагрэсія паказвае, што так лічбы маглі павялічвацца і па іншых пацярпелых рэгіёнах. Напрыклад, можна ўявіць такую сітуацыю па Гомельскай вобласці, дзе на 4 красавіка налічылі 25 тыс. галадаючых (Тур і Абраменка, 1947: 143–145). Трэба ўлічваць, што згаданыя звесткі, хутчэй за ўсё, няпоўныя, бо падлік вёўся ў першую чаргу ў пунктах, блізкіх да ўстаноў, адказных за збор такіх дадзеных. Такім чынам, па нашым меркаванні, не менш за 300 тысячаў чалавек пакутвалі ў БССР ад голаду па стане на ліпень 1947 года. Колькасць памерлых па гэтай прычыне не даследавана і патрабуе дадатковага вывучэння.

Вынік неўраджаю 1946 года мог бы быць іншым, калі б дзяржава рэальна дапамагла людзям. Аднак выкананне планаў ставілася вышэй за інтарэсы грамадзян. СМІ працягвалі друкаваць лісты Сталіну ад калгаснікаў з абавязацельствам датэрмінова выканаць дзяржаўны план хлебанарыхтовак да 30-й гадавіны Вялікага Кастрычніка. Дзеля геапалітычных інтарэсаў вышэйшае кіраўніцтва СССР, хаваючы цяжкае ўнутранае становішча, адмаўлялася ад міжнароднай дапамогі і нават наадварот – накіроўвала збожжа ў краіны сацыялістычнага лагера.

Замест рэальнай дапамогі галадаючым іх змушалі збіраць на пазыку дзяржаве грошы, якія не вярталіся, што яшчэ больш пагаршала становішча насельніцтва. Улады прадугледзелі дапамогу галадаючым БССР, але недастатковую, часта ў форме пазыкі з працэнтамі (Зіма, 1993: 44). Намаганні дзяржавы па захаванні хлеба праз павелічэнне колькасці рэпрэсіўных законаў пры недастатковым надзяленні галадаючых прадуктамі штучна павялічылі колькасць злачынцаў. У той жа час дзейнасць прадстаўнікоў мясцовых органаў улады знаходзілася пад моцным уплывам настрояў і чаканняў насельніцтва, падзей, якія адбываліся на рэгіянальным узроўні. Некаторыя з іх стараліся дапамагчы галадаючым пад пагрозай рэпрэсій.

Псіхалагічныя асаблівасці чалавека былі вызначальнымі пры выбары формы паводзін у сітуацыі голаду. Тыя, хто больш прыстасоўваўся і былі мабільнымі, мелі больш шанцаў на выжыванне. Хтосьці ад недахопу ежы еў лебяду, аддаваў дзяцей у дзіцячыя дамы, хтосьці сыходзіў працаваць у горад, хтосьці рабаваў за кавалак хлеба. Вельмі часта, каб дастаць прадуктаў, галадаючыя ехалі ў часткі СССР, дзе неўраджаю не было (Гарэнаў, 1947: 62).

З 6 па 11 мая 2013 года на тэрыторыі Ельскага, Мазырскага і Нараўлянскага раёнаў Гомельскай вобласці працавала экспедыцыя па зборы ўспамінаў сведак часу, арганізаваная ў межах праекта "Беларускі архіў вуснай гісторыі". Мэтай быў пошук інфармацыі пра голад 1946–1947 гадоў і яго ўплыў на лёс сведкаў часу рэгіёна. У інтэрв'ю спрабавалі выявіць, як узгадваюцца і асэнсоўваюцца гэтыя падзеі, прааналізаваць, якія стратэгіі паводзін выкарыстоўвалі людзі, каб выжыць ва ўмовах голаду. Успаміны запісваліся ў больш чым 20 населеных пунктах Палескага рэгіёна, якія паводле архіўных дакументаў асабліва пацярпелі падчас голаду 1946–1947 гадоў. Усяго было запісана 62 інтэрв'ю сведак часу, пераважна старэйшых за 80 год. Большасць рэспандэнтаў пражывалі ў гэтай мясцовасці ўсё жыццё.

Асноўнай стала паўадкрытая форма біяграфічнага інтэрв'ю, калі рэспандэнту давалася магчымасць распавесці пра свой жыццёвы шлях, адказаць на ўдакладняючыя пытанні, а пасля на тэматычныя паводле спецыялізаванага апытальніка. Сабраны матэрыял (Беларускі, 2013) дазваляе прэзентаваць тэму голаду з пункту гледжання вусных сведчанняў, дапаўняе гістарычную карціну, якая прадстаўлена ў дасяжных архіўных дакументах. Выкарыстоўваючы рэканструктыўны метад аналізу можна хаця б часткова аднавіць сітуацыю з пункту гледжання тых, хто яе перажыў.

Усе сведкі пацвярджаюць факт пасляваеннага голаду. Найбольш важнай тэма голаду ва ўспамінах была для тых, хто ў той час

знаходзіўся ў падлеткавым узросце ці толькі стварыў сям'ю, працаваў у калгасе, пражываў у населеным пункце, асабліва пацярпелым ад вайны. Вопыт голаду для іх быў траўматычным, успаміны пра яго часта выклікалі моцныя эмоцыі, у першую чаргу, з-за пакутаў блізкіх людзей, выкліканых ім.

Сведкі рабілі акцэнт на параўнанні двух голадаў, якія перанёс рэгіён – 1932–33 і 1946–47 гадоў. Ва ўспамінах першы быў асабліва страшным, ад яго ў некаторых населеных пунктах, па вусных сведчаннях, памерла да паловы складу насельніцтва. Пасляваенны голад успрымаўся таксама як цяжкі: людзі цярпелі ад хвароб, з ім звязаных, недахопу ежы, таксама былі выпадкі смерці ад недаядання. Сведкі шмат распавядалі пра індывідуальныя стратэгіі выжывання ў такіх няпростых умовах. Яны дзяліліся інфармацыяй пра тое, якія стравы былі асноўнымі на стале, дзе здабывалі прадукты, якіх не ставала, як жылося калгаснікам, якія абавязкі яны мелі перад дзяржавай і ці дапамагала яна ім.

Інтэрв'юяваныя адзначалі недастатковую падтрымку з боку дзяржавы пры вялікіх патрабаваннях па грашовых і прадуктовых пастаўках, нявыплаце заробкаў у калгасе. Таму вельмі цанілі людскую ўзаемадапамогу. А таксама прызнавалі, што просты чалавек быў вымушаны абіраць не заўсёды законныя з афіцыйнага пункту гледжання шляхі для выжывання. Напрыклад, такімі былі крадзяжы калгаснай маёмасці, жабрацтва на тэрыторыі заходніх абласцей БССР і іншае.

Такім чынам, можна адзначыць, што ўспаміны сведак часу істотна дапаўняюць наяўную інфармацыю з друкаваных і традыцыйных крыніц пра голад 1946–47 гадоў. Яны даюць чалавечае вымярэнне гэтай трагедыі і паказваюць, як людзі пераадольвалі яе, спадзеючыся толькі на ўласныя сілы. Траўматычны ўплыў голаду на свядомасць сведак гэтага рэгіёна паказвае, што тэма патрабуе дадатковай увагі і больш дэтальнага вывучэння даследчыкамі.

### *Бібліяграфія*


1. Беларускі архіў вуснай гісторыі: Ельск, 2013, URL (доступ 21.01.2014): http://www.nashapamiac.org/archive/archivetree.html

2. Гарэнаў (1947). *Даклад аб рабоце ваеннай пракуратуры Брэст-Літоўскай чыгункі за II квартал 1947,* 19.7.1947. НАРБ, Ф. 4п, воп. 29, спр. 602, арк. 39–102.

3. Зима, Вениамин (1993). "Голод в России 1946–1947 годов", *Отечественная история,* № 1: 35–52.

4. Карасёў, І. (1947). *Дакладная ЦК КП(б)Б,* 22.03.47. НАРБ, Ф. 4п, воп. 29, спр. 566, арк. 115–116.

5. Крупеня, Іван (1947). *Дакладная ў ЦК КП(б)Б,* 11.7.1947. НАРБ, Ф. 4п, воп. 29, спр. 551, арк. 16–23.
6. Тур, Іван і Абраменка (1947). *Інфармацыя ЦК КП(б)Б,* 4.4.1947. НАРБ, Ф. 4п, воп. 29, спр. 566, арк. 143–145.